

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

№ 4 (189) 11 лістапада 1992 г.


## Афіцыйная хроніка

### АБ НАДЗЁННЫХ СПРАВАХ

На чарговым пасяджэнні Вучонай рады універсітэта абмеркавана пытанне «Вынікі і меры па ўдасканаленню навукова-даследчай работы студэнтаў ва універсітэце». З дакладам выступіў першы прарэктар А. І. Васкабоеў (тэкст даклада змешчаны ў сённяшнім нумары).

У прынятай пастанове рада адзначыла, што ў новых умовах, пры пераходзе на двухузроўневую падрыхтоўку спецыялістаў, сістэма НДРС патрабуе карэннай рэарганізацыі. Палічана мэтазгодным перадаць арганізацыю курсавых і дыпломных прац навуковаму аддзелу.

Рада абавязала навуковы аддзел сумесна з факультэтамі распрацаваць комплексную праграму навукова-даследчай работы студэнтаў на ўвесь перыяд навучання па ўсіх спецыяльнасцях і факультэтах з улікам пераходу універсітэта на двухузроўневую сістэму навучання. Для распрацоўкі гэтай праграмы створана спецыяльная камісія. Аналагічныя камісіі будуць працаваць таксама на факультэтах. Прадугледжваецца пашырыць правы факультэтаў і кафедраў як базавага звяна вучэбнага працэсу і навуковых даследаванняў студэнтаў, а таксама меры матэрыяльнага заахвочвання выкладчыкаў, якія актыўна ўдзельнічаюць ў гэтай справе.

Адбыліся таксама выбары па конкурсу. Вучонай радай прысвоена званне прафесара М. В. Васілючаку і Е. П. Крамлёву, дацэнта — І. А. Болдаку, В. М. Бурдзю, С. Н. Бярозкінай, С. В. Емельянчык, Э. С. Ярмусіку. Коўкель І. І. выбраны прафесарам кафедры гісторыі Беларусі.

Вучоная рада ўнесла таксама некаторыя змены ў Статут універсітэта.

### СХОД СУПРАЦОЎНІКАЎ

На сходзе супрацоўнікаў універсітэта, які прайшоў 28 кастрычніка, абмеркаваны актуальныя пытанні, якія стаяць зараз перад калектывам. Рэктар А. В. Бадакоў у сваім дакладзе расказаў пра вынікі мінулага навучальнага года, спыніўся на цяжкасцях і праблемах, якія ўзнікаюць у гэты нялёгкі час.

Выступаўшыя ў спрэчках закранаді балючыя пытанні нашага жыцця, заклікалі сумеснымі намаганнямі станоўча іх вырашаць. Асаблівая ўвага павінна надавацца паляпшэнню якасці навучання і выхавання, укараненню новых інфармацыйных тэхналогій, пашырэнню ўдзелу ў навуковай і камерцыйнай дзейнасці.

### РЭКТАРАТ ДЗЕЙНІЧАЕ

Згодна з рашэннем Вучонай рады адноўлена работа рэктарата. Адбыліся першыя яго пасяджэнні. Зацверджаны план работы, абмяркаваны парадак прэміявання супрацоўнікаў, пытанні дысцыпліны, заключэння дагавароў па падрыхтоўцы спецыялістаў і інш.

Рэктарат будзе збірацца адзін раз у месяц і абмяркоўваць надзённыя пытанні жыцця калектыву.

### ЗА ПЛЁННУЮ ПРАЦУ

Загадам рэктара ад 27 кастрычніка група студэнтаў прэміявана за добрасумленную і старанную працу на сельгасработах у Астравецкім раёне. Студэнт 5 курса філалагічнага факультэта Аляксандр Дробыш адзначаны прэміяй у памеры месячнай стыпендыі.

Марына Сакалова, Ларыса Худзякова, Алена Шалесная, Ірына Хлістакоўская і Генадзь Кот — студэнты 3 курса філфака — прэміяваны ў памеры 0,5 стыпендыі. Іх калегам — Кацярыне Канчэўскай, Алене Волк, Наталлі Язерскай, Наталлі Скарабагатавай, Тамары Доўгель, Ірыне Салей, Жане Даніловіч і Жане Янкоўскай аб´яўлена падзяка.

Па хадайніцтву сярэдняй школы № 9 г. Гродна падзяка аб´яўлена таксама студэнтам, якія вызначыліся пры падрыхтоўцы і правядзенні тэатралізаванага свята ў Каложскай царкве «Прысвячэнне ў маленькія грамадзяне Беларусі». Сярод іх — Віктар Руднік (5 курс, гістфак), Сяргей Дрозд (3 курс, гістфак), Аляксандр Пугачоў (4 курс, факультэт правазнаўства), Аляксандр Сувораў (3 курс, факультэт беларускай філалогіі і культуры), Вольга Нестар (3 курс, філфак).

МАЛАЙЦЫ!

### ПЕРШЫ АКАДЭМІК

Прыемная навіна прыйшла ў Гродна з Расійскай Федэрацыі. Старэйшы педагог і навуковец, прафесар універсітэта Анатоль Іванавіч Яроцкі выбраны акадэмікам акадэміі імя Цыялкоўскага.

Так высока ацэнены яго навуковыя распрацоўкі і ўклад у асваенне касмічнай прасторы.



У мінулую пятніцу закончыліся заняткі на чарговым патоку школы бізнесу і кіравання, якая дзейнічае пры універсітэце. Дыпломы аб заканчэнні вучобы атрымалі 11 чалавек — будучых бізнесменаў і прадпрымальнікаў.

На здымку: група выпускнікоў школы пасля ўручэння дыпломаў.

Фота У. САРОКІНА.

(Матэрыял пра школу бізнесу і кіравання чытайце на 2-й старонцы).

## Навука запрашае маладых

А. І. ВАСКАБОЕЎ, першы прарэктар універсітэта

Навукова-даследчая работа студэнтаў мае сваёй мэтай падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў. Для многіх студэнтаў работа даследчага характару — гэта магчымасць прымяніць атрыманыя веды на практыцы. Напрыклад, кафедрай квантавай электронікі (загадчык — прафесар С. С. Ануфрык на базе абласной станцыі «Юнага тэхніка» створана навуковая лабараторыя тэхнічнай творчасці, дзе студэнты маюць магчымасць выконваць курсавыя і дыпломныя праекты, вынікі якіх прадстаўляліся на выставу ў выглядзе вопытных макетаў. Кафедрай таксама сумесна з фізіка-тэхнічным ліцэем створаны навуковыя лабараторыі, дзе студэнты маюць магчымасць выконваць курсавыя работы.

Асноўнымі формамі ўдзелу студэнтаў у навукова-даследчай рабоце з´яўляюцца семінары навуковых кіраўнікоў, навуковыя гурткі, напісанне курсавых і дыпломных работ, дзяржбюджэтныя і гаспадарча-разліковыя тэмы, удзел у алімпіядах, у рабоце навукова-даследчых лабараторый, прадстаўленне навуковых прац на рэспубліканскі конкурс, правядзенне студэнцкіх навуковых канферэнцый.

Семінары навуковых кіраўнікоў арганізаваны на выпускаючых кафедрах, часткова і на агульнаадукацыйных. Работа тут носіць як пошукавы, так і канкрэтна-тэхнічны характар. Тэматыка семінараў навуковых кіраўнікоў прывязана да гаспадарча-бюджэтных, кафедральных, а таксама гаспадарча-разліковых.

На факультэце правазнаўства, напрыклад, студэнты актыўна працуюць у навукова-даследчай лабараторыі па тарыфікацыі і заканадаўству, выкарыстоўваюць вучэбныя і навукова-метадычныя распрацоўкі.

Гуртковыя працы — адна з найбольш характэрных і распаўсюджаных форм НДР. Ёю ахоплена амаль 25 працэнтаў студэнтаў. Іх вынікі часта выкарыстоўваюцца ў дакладах на студэнцкіх канферэнцыях. Лідзіруе ў гэтай галіне гурток, створаны на гістарычным факультэце больш як 30 гадоў назад. Кіруе ім цяпер прафесар Крэнь І. П. Акрамя таго, шмат прайшоўшых праз гурток студэнтаў адчулі цягу да навукі, гурткоўцы зрабілі цікавыя даклады на шэрагу канферэнцый.

Плённа працуюць навуковыя студэнцкія гурткі на біялагічным факультэце, кіраўнікамі якіх з´яўляюцца В. М. Бурдзь, К. А. Мандрык, С. В. Емельянчык. Тут студэнты набываюць першыя навыкі ў галіне НДР, што дае вялікі плён пры падрыхтоўцы дыпломных прац.

З вялікай цікавасцю працуюць у навуковых гуртках па вывучэнню псіхалогіі супрацоўніцтва, якімі кіруюць А. У. Родзік, А. С. Сідарчук, студэнты факультэта педагогікі і методыкі пачатковага навучання.

Каля 70 студэнтаў наведваюць навуковыя семінары і гурткі, якія вядуць выкладчыкі педагогікі. Разам з кіраўнікамі навуковых прац (І. А. Карпюк і В. П. Таранцей) надрукаваны дзве навуковыя працы. Студэнты, якія спецыялізуюцца на кафедры педагогікі, прымалі ўдзел у 20 кафедральных, рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях, публікавалі тэзісы.

Ва універсітэце шырока прымяняюцца такія формы навуковай працы студэнтаў як курсавое і дыпломнае праектаванне, удзел у навуковых інжынерна-канструктарскіх работах, укараненне іх вынікаў у практыку. Так, з 290 дыпломных прац, абароненых у 1992 годзе, больш як 100 былі рэкамендаваны да ўкаранення.

Трэба адзначыць і такі напрамак студэнцкай навуковай работы як публікацыя навуковых прац. Так, толькі на гістарычным факультэце за гэты год у перыядычным друку і ў навуковых зборніках было надрукавана звыш 10 работ.

На фізічным факультэце студэнты ўдзельнічалі у рабоце ўсеагульнай студэнцкай канферэнцыі па фізіцы ў Навасібірску, дзе былі апублікаваны два даклады. У бягучым годзе студэнты факультэта педагогікі і методыкі пачатковага навучання (кіраўнік П. Р. Галуза) надрукавалі тэзісы даклада ў Мінску на канферэнцыі «Праблемы народнай педагогікі ў Рэспубліцы Беларусь».

(Працяг на 2-й стар.).

# Навука запрашае маладых

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).**

Штогод ва універсітэце на факультэтах праходзіць унутраны тур конкурса на лепшую навуковую працу. Лепшыя з іх накіроўваюцца на рэспубліканскі тур. У гэтым годзе накіравана 51 праца: біяфак — 5; гістарычны — 6; фізічны — 4; пачфак — 4; правазнаўства —11; фізічнай культуры — 3; матэматычны — 8; беларускай філалогіі і культуры — 5; інжынерны — 5.

Прынамсі, хачу заўважыць, што зусім нядаўна атрыманы вынікі саюзнага конкурсу за 1990 год. З 11 нашых работ 2 былі адзначаны вышэйшымі ўзнагародамі. Работа студэнта Рудніцкага, выкананая пад кіраўніцтвам дацэнта Сцепіна, адзначана медалём «За лепшую студэнцкую працу». На 33 ВНУ Рэспублікі Беларусь такіх узнагарод было 6. На жаль, работы, дасланыя ў мінулым годзе, вярнулі назад, паколькі Усесаюзнага тура цяпер не існуе.

Адной з форм заахвочвання студэнтаў да рашэння неардынарных задач з'яўляюцца алімпіяды. Пасля свайго універсітэцкага тура фарміруюцца каманды да ўдзелу ў рэспубліканскіх турах.

У 1992 годзе студэнты універсітэта занялі першае месца ў рэспубліканскай алімпіядзе па біялогіі (заўважым, 3 гады ўжо запар), другое — па матэматыцы, трэцяе — па правазнаўству. Другое месца на алімпіядзе па псіхалогіі заняла каманда факультэта педагогікі і методыкі пачатковага навучання. Першае месца на рэспубліканскай алімпіядзе па фізіялогіі заняла каманда студэнтаў другога курса факультэта фізічнай культуры. Актыўны ўдзел у падрыхтоўцы каманд прымалі выкладчыкі Ю. М. Вувунікян, І. В. Гушчын, Г. А. Зорын, Н. А. Пераверзева, А. В. Рыжая, А. М. Карабанаў. Па шэрагу паказанняў мы выглядзім добра сярод іншых ВНУ РБ. Але ўвогуле інтарэс да НДРС у апошні час зніжаецца. Гэта і недахоп фінансавых і матэрыяльных сродкаў, гэта і нежаданне загадчыкаў кафедр прыцягваць студэнтаў да выканання НДВКР, прывіваць ім інтарэс да фундаментальнай навукі, шукаць новыя формы работы. Аб'ектыўных прычын тут, на жаль, нямала. Візуючы загады аб сумяшчальніцтве, заўважаем, што вялікая колькасць выкладчыкаў працуе на паўтары стаўкі ды яшчэ 240 гадзін пагадзіннага фонду. Пры такой нагрузцы можна быць толькі рэпетытарам, а не навукоўцам. Можна было б шмат гаварыць і аб адсутнасці сацыяльнага заказу на добрага навукоўца, і аб пагардлівых адносінах да гэтай катэгорыі з боку улад, і аб жабрацкім стане выкладчыцкага корпусу і яшчэ шмат аб чым.

Не трэба нам ператварацца ў рэпетытараў і ўрокадавальнікаў, нягледзячы на цяжкія абставіны. Вось апошні прыклад з жыцця студэнтаў-фізікаў. На вечар, прысвечаны інагурацыі ў студэнты першакурснікаў, прыйшоў толькі адзін намеснік дэкана, іншых выкладчыкаў студэнты не дачакаліся. Няўжо студэнты заслужылі такой непавагі ў свой урачысты дзень?

Але ж не хлебам адзіным жыве чалавек. А класічная фармулёўка — настаўнік, выхавай вучня,— думаю, будзе вечнай. Бо кожнага з нас хтосьці ў свой час прывабіў да навукі. Дык давайце будзем заўсёды памятаць пра гэта!

ЧАСТА Ў АЎДЫТОРЫЯХ, КАЛІДОРАХ УНІВЕРСІТЭТА МОЖНА ЎБАЧЫЦЬ ЛЮДЗЕЙ, ЯКІЯ, ЗДАЕЦЦА, МАЛА ПАДОБНЫЯ НА СТУДЭНТАЎ. ЯНЫ БОЛЬШ ДАРОСЛЫЯ, ПАВАЖНЫЯ, СУР'ЁЗНА ЗАКЛАПОЧАНЫЯ. АЛЕ АБ'ЯДНОЎВАЕ ІХ АДНО — ЦЯГА ДА ВЕДАЎ. ГЭТА СЛУХАЧЫ ШКОЛЫ БІЗНЕСУ І КІРАВАННЯ, ЯКАЯ СЁЛЕТА АДКРЫЛАСЯ І ПРАЦУЕ ПРЫ УНІВЕРСІТЭЦЕ. РОЎНА А ВЫЗНАЧАНАЙ ГАДЗІНЕ ПРЫХОДЗЯЦЬ ЯНЫ НА ЗАНЯТКІ, КАБ ПАСЛУХАЦЬ ЛЕКЦЫЮ, ПАПРАЦАВАЦЬ ЗА КАМП'ЮТАРАМ У ЧАС ДЗЕЛАВОЙ ГУЛЬНІ, АБМЯНЯЦЦА ДУМКАМІ АБ РЫНКУ, ПРАДПРЫЙМАЛЬНІЦТВЕ, ПЕРСПЕКТЫВАХ ІХ РАЗВІЦЦЯ.

УНІВЕРСІТЭЦКАЯ ШКОЛА БІЗНЕСУ АТРЫМАЛА НАДЗВЫЧАЙ ШЫРОКІ РЭЗАНАНС У ГОРАДЗЕ І РЭСПУБЛІЦЫ. ПЕРШ ЗА ЎСЁ ТЫМ, ШТО ДАЕ ЯНА БУДУЧЫМ І ЦЯПЕРАШНІМ БІЗНЕСМЕНАМ ДОБРЫЯ І ТРЫВАЛЫЯ ВЕДЫ, ДАЛУЧАЕ ДА САКРЭТАЎ РЫНКАВАЙ ЭКАНОМІКІ, УВОДЗІЦЬ У НЯЗВЕДАНЫ СВЕТ ЗАЎТРАШНЯЙ БУДУЧЫНІ.

МЕНАВІТА ТАМУ РЭДАКЦЫЯ ПАЛІЧЫЛА МЭТАЗГОДНЫМ БОЛЬШ ПАДРАБЯЗНА РАСКАЗАЦЬ ПРА ГЭТУЮ НОВУЮ ФОРМУ НАВУЧАННЯ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ. ПАДЗЯЛІЦЦА СВАІМІ МЕРКАВАННЯМІ МЫ ПАПРАСІЛІ НАМЕСНІКА ДЫРЭКТАРА ШКОЛЫ БІЗНЕСУ ЮРЫЯ ЭДУАРДАВІЧА БЯЛЫХ — КАНДЫДАТА ФІЗІКА-МАТЭМАТЫЧНЫХ НАВУК, ЗАГАДЧЫКА ВУЧЭБНАГА АДДЗЕЛА УНІВЕРСІТЭТА

*Юры Бялых:*

## «Школа бізнесу — крок у заўтра»

ШКОЛА бізнесу працуе пры універсітэце з сакавіка гэтага года. З'яўленне яе выклікага шэрагам абставін. У апошні час, у сувязі з пераходам да рынку, паўстала праблема і ў нас з падрыхтоўкай кадраў для новых структур. Кіраўніцтва універсітэта яшчэ летась прадугледзела неабходнасць стварэння такой сістэмы вучобы людзей бізнесу, якая максімальна акумулявала бы лепшы вопыт падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў для народнай гаспадаркі. Нашы спецыялісты, і я ў тым ліку, сталі выязджаць на розныя курсы, цікавіцца навінкамі, шукалі новыя формы арганізацыі вучобы. Прыйшлі да высновы, што і ў Гродна ёсць умовы для стварэння школы бізнесу. Галоўным звяном у сістэме падрыхтоўкі кадраў павінен быў стаць універсітэт, бо ў ім ёсць база і магчымасці акумуляваць веды.

У нашым горадзе і раней былі спробы фарміраваць школы бізнесу, ёсць і зараз. Але мяне гэта не палохае. Мы маем ужо пэўны вопыт, людзі нам паверылі, а гэта надае ўпэўненасці.

Скажу шчыра, тэхналогія і арганізацыя вучобы ў школе бізнесу няпростыя. Бо справа новая і невядомая для многіх з нас. А першапраходцам заўсёды цяжэй. Паступова план стварэння школы тансфарміраваўся ў праграму перападрыхтоўкі кадраў для рынку. Ад ідэі да рэалізацыі прайшоў год. На працягу яго ішла падрыхтоўка кадраў выкладчыкаў для новай школы, метадычных матэрыялаў. У прыватнасці, карысныя кантакты з Беластоцкай школай бізнесу, адкуль пераняліі многія элементы тэхналогіі вучобы. Выкладчыкі гэтай школы працуюць ў нас, выступаюць на занятках.

Зроблены ўжо чатыры выпускі. Працавалі з імі ў розных формах. Ёсць свая тэхналогія навучання, якая адрозніваецца ад ВНУ. Мы набіраем невялікія групы і даём ім вялікую нагрузку. Меру інтэнсіфікацыі навучання прапануюць самі слухачы. Спачатку, на першых занятках школы, мы аберагалі людзей, устанавілі «щадящий» рэжым, але слухачы паправілі нас.

Аналізуючы ход вучобы, заўважаеш, што паступова мяняюцца адносіны слухачоў да складаных прадметаў, знікае недавер да таго, ці патрэбна ўвогуле гэта вучоба. Ужо з'явілася ўпэўненасць, што рынак усё роўна прыйдзе, што вывучаемыя законы, методыкі не ілюзорныя, а яны дзейнічаюць, хоць і слаба. Напрыклад, вясной перад намі не стаяла пытанне, як прадаць, быў бы тавар. Тады некаторыя скептычна адносіліся да такога паняцця як маркетынг. Сёння сітуацыя іншая, з'явілася праблема збыту. Вось і вучым сваіх слухачоў, як працаваць у новых умовах.

У нашай школе вучацца і зусім навічкі, і людзі з вопытам работы ў бізнесе, у яго арганізацыйных структурах. Але ўсіх яднае цяга да ведаў, набыцця ведаў і ўменняў.

Важным элементам мы лічым правядзене псіхалагічнай карэкцыі слухачоў. Значнае месца адводзіцца прававым пытанням. Праводзім делавыя гульні, з выкарыстаннем камп'ютараў, дзе вывучаем германскую мадэль рынка канца 80-х гадоў. У адпаведнасці з гульнёй слухачы могуць атрымаць новыя веды і навыкі, зверыць свае дзеянні і скарэкціраваць іх, зрабіць адпаведныя вывады.

Вывучаюцца таксама асновы кіравання, эканомікі, пытанні падаткавай сістэмы, фінансавання. Значная ўвага надаецца сустрэчам са спецыялістамі, у прыватнасці з кіраўнікамі дзяржаўных структур, бірж, банка. Вядучыя спецыялісты розных галін прыцягваюцца да выкладання ў нашай школе бізнесу і кіравання.

Асноўная нагрузка, безумоўка, падае на выкладчыкаў універсітэта. Працуюць у нас толькі энтузіясты. На жаль, плата, якую мы бярэм за вучобу, не дазваляе выплачваць большы ганарар. І тым не менш вучоныя універсітэта згаджаюцца працаваць у школе, бо, лічаць яны, школа бізнесу і кіравання — гэта своеасаблівы элемент у агульнай структуры універсітэта, на яе базе набываецца добрая практыка далейшай работы са студэнтамі. Дарэчы, новае аддзяленне знешнеэканамічнай дзейнасці на правазнаўчым факультэце цесна звязана з нашай школай бізнесу. Падтрымліваюцца сувязі з матэматычным факультэтам, правазнаўцамі.

Я перакананы, што праца ў школе бізнесу шмат дае нашым выкладчыкам і ў час кантактаў з практыкамі, якімі з'яўляюцца слухачы. Адзначу плённую аддачу ў школе Ф. Б. Марголіна, І. Ф. Міхальчанка, К. У. Вербавай, Н. Н. Іванова, Я. У. Багданава, І. І. Віленты.

Школа бізнесу і кіравання падрыхтавала за кароткі час каля 50 спецыялістаў. Нас радуе, што некаторыя з іх паспяхова працуюць, адкрылі вытворчасць. Так, у г. Гродна каля аўтавакзала малое прадпрыемства нашых выпускнікоў выпускае салодкую вату. Попыт на яе вялікі.

Ці ёсць перспектыва ў нашай школе? Ёсць. Атрыманы ўжо заяўкі на далейшую перападрыхтоўку з малых прадпрыемстваў. Чарговыя заняткі пачнуцца ў пачатку снежня. Школа ператвараецца ў адзін з элементаў сістэмы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў у нашай вобласці.

Я глыбока перакананы, што перавучвацца трэба ўсім нам. Кожнаму з нас трэба ведаць асновы рынкавай эканомікі. Неабходны гэтыя веды і выпускнікам універсітэта. Зараз ідзе фарміраванне міжфакультэцкіх патокаў для падрыхтоўкі спецыялістаў па кіраванню ў прамысловасці і народнай адукацыі, што дасць магчымасць забяспечыць выпускнікоў універсітэта ведамі, якія потым ім вельмі спатрэбяцца ў рабоце.

## ЗАПРАШАЕ ПРАФКАМ

Прафсаюзны камітэт супрацоўнікаў універсітэта імкнецца як мага лепш правесці аздараўленне сваіх супрацоўнікаў, клапоціцца аб набыцці пуцёвак у санаторыі і дамы адпачынку. Хоць зрабіць гэта вельмі і вельмі нялёгка. Так, з пачатку года прафкаму выдзелена 91 пуцёўка, з іх 45 — санаторных, 8 — дзіцячых, 26 у дамы адпачынку і 11 — у піянерскія лагеры. Для параўнання скажу, што за ўвесь мінулы год намі было атрымана толькі 53.

Таму я хачу звярнуцца да ўсіх членаў прафкама: патрэбна пуцёўка — заходзьце ў прафкам. І мы вам пастараемся дапамагчы.

Кожны, хто хоча паехаць на лячэнне, павінен падаць заяву ў прафкам (п. 302). Аб наяўнасці пуцёвак мы пастаянна інфармуем праз стэнд інфармацыі ў галоўным корпусе.

Ва універсітэце мяркуецца ў бліжэйшы час адкрыць медыцынскі кабінет функцыянальнай дыягностыкі, дзе будуць прымаць урачы-кардыёлагі, эндакрынолагі і інш. Частку выдаткаў рашыў узяць на сябе прафкам. Гэтае пытанне абмяркоўвалася нядаўна на пасяджэнні прафкама.

Чакаем вашых пытанняў, пажаданняў па ўсіх пытаннях аховы здароўя.

**Л. БАБРОЎНІК, член прафсаюзнага камітэта.**

## ДОБРАЯ ТРАДЫЦЫЯ

На факультэце беларускай філалогіі і культуры ёсць даўняя традыцыя праводзіць конкурсныя агляды нумароў мастацкай самадзейнсці. На такіх аглядах «навічкі-студэнты» першага курса паказваюць сваё ўменне спяваць, танцаваць, артыстычныя здольнасці, сваю весялосць і гумар. Дні правядзення заўсёды станавіліся маленькім святам для першакурснікаў.

Гэты год не выключэнне. 22 кастрычніка ў актавай зале факультэта беларускай філалогіі і культуры адбыўся конкурсны агляд нумароў самадзейнасці. Кожная акадэмічная група першага курса выставіла на суд журы па чатыры нумары, з якіх трэба было выбраць самы дасканалы, цікавы, удалы. Судзіла выканаўцаў «строгае» журы: дэкан факультэта беларускай філалогіі і культуры Жук І. В., намеснік дэкана Навіцкі П. Л., студэнты Казлоўскі Р., Хвядук І., Стэльмах А.

У час конкурсу перад гледачамі выступаў гумарыстычны хор, спявалі частушкі, высмейвалі заганныя з'явы жыцця нашага грамадства, гучаў верш пра наш факультэт, выконваліся перакладзеныя на беларускую мову песні папулярных спевакоў. Першакурснікі далі новую інтэрпрэтацыю вобразаў выкладчыка і студэнта. Усе выступленні гучалі на беларускай мове.

Адзінагалосна журы аддало перамогу першай групе за нумар «Ляцелі гусі», які аказаўся самым цікавым і дасканалым на конкурсе. Лепшыя выканаўцы атрымалі запрашэнне ў шоу-гурт «ЦВіК», выступленне якога адбудзецца ў канцы лістапада.

**Руслан КАЗЛОЎСКІ, студэнт 5 курса факультэта беларускай філалогіі і культуры.**

### Гэта цікава

## Народныя прыкметы

Шмат аб чым цікавым можна даведацца з народных прыкмет. На ўласным вопыце можна часамі пераканацца ў іх дакладнасці. У народных прыкметах-самацветах народнай моватворчасці адбіўся багаты вопыт беларускага народа, накопленая стагоддзямі мудрасць, звычаі, уклад жыцця і побыту людзей.

Правяраючы гэтыя прыкметы на ўласным вопыце, мы яшчэ раз пераконваемся ў багацці розуму і назіральнасці беларускага народа. Бо ўсё гэта пайшло яшчэ з тых даўніх часоў, можна нават сказаць, з так званага анімістычнага грамадства, калі чалавек адухаўляў усе праявы навакольнага жыцця, калі ён уяўляў прыроду, грамадства і ўвесь свет адной велізарнай радавой абшчынай.

Здаўна людзі прадказвалі надвор'е толькі па народных прыкметах. Кожнаму месяцу года адпавядалі свае прыкметы, дзе без назіральнасці не абысціся.

Амаль што за кожнай прыкметай хаваецца так званая Нячыстая сіла. Яна жыве пад падлогай кожнай вясковай хаты, селіцца ў падпеччы, у хляўчуках. Нячыстая сіла пралазіць да людзей усюды, як кажуць, бокам і нізам,— каб нашкодзіць людзям, спустошыць і абразіць чалавечую душу. І вось якраз праз народныя прыкметы паказана, як чалавек змагаецца з Нячыстай сілай, як ён хоча вымесці яе са сваёй хаты.

**Вось некаторыя з іх:**

— Мятла ў хаце павінна стаяць уверх памялом, тады яна будзе адганяць злых духаў.

— Пасля таго, як памыешся, нельга страсаць ваду з рук: ад гэтага чэрці пладзяцца. Колькі ўпадзе пырск, столькі будзе і чарцей.

— Калі што -небудзь згубіцца, тады «перавязваюць бараду чорту»: абвязваюць ножку стала хустачкай ды кажуць: «Чорт, чорт, пагуляй ды зноў аддай».

— Калі сядзіш на крэсле, нельга класці нагу за нагу і гайдаць нагою — гавораць, што чорта гайдаеш.

— Калі перапыняеш чытанне кнігі, дык не пакідай яе адчыненай, разгорнутай, бо запамятаеш усё, што чытаў.

**А цяпер некалькі прыкмет, якія звязаны з нашым асабістым жыццём:**

— Правая далонь чэшацца — да прыбытку, левая — да страты.

— Шчокі чэшуцца альбо гараць — да слёз.

— Кошка чэшацца — гасцей зазывае.

Калі, выходзячы з хаты, зачэпішся,— хутка зноў там будзеш.

Калі мыеш падлогу, трэба добра мыць парог, а то будзе свякруха злая.

— Нельга шыць на сабе, бо памяць зашыеш.

Нельга есці з нажа, бо мужык будзе п'яніцай.

— Калі каля акна сядзіць сарока, то хутка будуць госці.

— У маі нельга жаніцца або выходзіць замуж — усё жыццё будзеш маяцца.

— Калі перадаеш другому соль, то трэба засмяяцца, каб не пасварыцца.

— Калі дарогу перабяжыць чорны кот — не пашанцуе.

## Гаспадынька

### З сакрэтаў заваркі чаю і кавы

*Захоўвайце сухі чай у цёмным месцы ў шчыльна закрытых шкляных, металічных або пласмасавых чайніцах. Гэта засцерагае яго ад страты водару і іншых пахаў.*

***

*Перад заваркай адначасова з сухім чаем пакладзіце на дно чайніка невялічкі кавалачак цукру, тады настой будзе больш моцным і прыемным на смак.*

***

*Чай з лімонам будзе асабліва духмяным, калі лімон абдаць кіпяткам, нацерці на тарцы ад лімона (цэдру) і апусціць яе ў шклянку, потым пакласці цукар, усё добра перамяшаць, наліць чай, а потым ужо дадаць кавалачак лімона без лушпіны.*

***

*Для таго, каб кава лепш захоўвала свой смак і водар, яе трэба малоць толькі ў той колькасці, якая патрабуецца на адну заварку, папярэдне падагрэўшы зерне, так яно лепш мелецца.*

***

*Як абжарыць сырую каву (зерне)? Скаварaду лепш узяць чыгунную і папярэдне накаліць, таму што кава вельмі лёгка ўспрымае розныя пахі (рыбы, цыбулі). Змажце скаварaду сметанковым маслам. Абжарваючы, увесь час памешвайце зерне да той пары, пакуль яно не стане цёмна-карычневага колеру.*

***

*Зерне кавы, якое захоўвалася доўгі час, страчвае свой водар, яго можна аднавіць, паклаўшы зерне на паўтары гадзіны ў халодную ваду і адразу пасля гэтага высушыўшы ў духоўцы.*

***

*Кава будзе смачнейшай, калі ў момант закіпання апусціць у ваду крышку солі, а таксама наліваць яе ў падагрэтыя кубкі.*

***

*Для таго, каб гушча не трапляла ў кубак, змеленую каву можна засыпаць у чыстую торбачку і, завязаўшы яе, апусціць у кафейнік з кіпячай вадой. Пасля кожнай заваркі торбачку акуратна прамываюць.*

***

*Халодная кава таксама вельмі смачная і духмяная. Падаюць яе, як дысерт, у бакалах, з узбітай смятанкай або маrожаным.*

***

*Зняўшы кафейнік з агню, наліце ў яго некалькі кропляў халоднай вады, тады гушча хутчэй асядзе.*

***

*Калі каву вараць не ў кафейніку, а ў каструлі, яе трэба потым працадзіць, каб гушча не трапіла ў шклянку.*

## Бібліятэка прапануе

### Новыя паступленні

У бібліятэку нашага універсітэта паступіў вучэбны дапаможнік **Манаёнкава А. Ф. «Русская диалектология»»**, напісаны у адпаведнасці з праграмай па аднайменнаму курсу філалагічных факультэтаў універсітэтаў. У асноўным ён адрасаваны для студэнтаў беларускіх ВНУ. Пра гэта сведчаць беларускія паралелі, якія праводзяцца ў дапаможніку, і глава аб рускіх гаворках на тэрыторыі Беларусі. Дадзеныя ў дадатку дыялектныя тэксты адлюстроўваюць характэрныя з'явы рускіх дыялектаў, сярэднерускіх гаворак, а таксама астраўных рускіх гаворак Беларусі, на якія паўплывала іншамоўнае акружэнне.

Прапануем вашай увазе кнігу **«Маркетинг: Толковый терминологический словарь-справочник»**.— М.: «Инфоконт», 1991. Слоўнік-даведнік змяшчае больш як 1 тыс. тэрмінаў, якія адносяцца да вобласці бізнесу, маркетынгу, рэкламы тавараў і паслуг, фінансаў і права. Слоўны артыкул тэрміну складаецца з яго наймення, тлумачэння, агульнапрынятай абрэвіятуры, калі яна ёсць, сінонімаў, англійскіх і нямецкіх эквівалентаў. У канцы слоўніка прыведзены слоўнік сінонімаў, англа-рускі, нямецка-рускі слоўнікі, спіс абрэвіятур і спіс выкарыстоўваемай літаратуры.

У кнізе **Ф. У. Тэйлара «Принципы научного менеджмента»**, на ідэях якой пабудавана ўся сістэма кіравання прадпрыемствамі ў капіталістычных краінах, разглядаюцца асноўныя элементы знакамітай «сістэмы Тэйлара». Ф. У. Тэйлар прызнаны раданачальнікам навуковага кіравання прадпрыемствамі — менеджмента.

Кніга адрасавана маладым пачынаючым бізнесменам, студэнтам юрфака, спецыялістам, якія жадаюць набыць вопыт на чужых дасягненнях і памылках, усім, хто хоча дабіцца поспеху і выстаяць ва ўмовах пераходу да рынку.

Аўтары кнігі **«Бунтари и правдоискатели в русской православной церкви»**.— М.: Политиздат, 1991. (Буганаў В. І., Багданаў А. П.), вучоныя-гісторыкі, расказваюць аб драматычных момантах у гісторыі рускай праваслаўнай цэркві з XIV па XX ст. Героі апавядання — веруючыя, якія ў пошуках праўды трапілі ў сутыкненне з царкоўнай арганізацыяй і дыктатам самадзяржаўнай краіны. Чытачы даведаюцца аб поглядах і лёсе мітрапаліта Піліпа Калычова, які выступіў супраць тэрору Івана Грознага, пазнаёмяцца з патрыярхам Ніканам, з манахамі абложанага ўрадавымі войскамі Салавецкага манастыра. Героямі кнігі з'яўляюцца стараверцы-някрасаўцы, маскоўскі лекар-ератык Д. Е. Тверыцінаў, прыгонны вольнадумец Фёдар Падшывалаў, а таксама гісторык рускай царквы, прафесар духоўнай акадэміі Н. Ф. Капцяроў.

Для студэнтаў факультэта пачатковага навучання мы прапануем кнігу **М. М. Бязрукіх, С. П. Яфімава «Знаете ли вы своего ученика?»** — М.: Просвещение, 1991. У кнізе расказваецца аб асаблівасцях псіхалагічнага і фізіялагічнага развіцця дзяцей малодшага школьнага ўзросту, даюцца практычныя рэкамендацыі па карэкцыі адаптацыі дзяцей да школы.

Усім, каго цікавяць праблемы псіхалогіі асобы мы рэкамендуем пазнаёміцца з кнігай **Семка В. Я. «Умейте властвовать собой, или Беседы о здоровой и большой личности»**.— Навасібірск: Навука, 1991.

Таямніцы чалавечай псіхікі — наколькі яны пазнавальныя ў наш час? Якія «ступені» развіцця асобы і ў чым заключаецца своеасаблівасць яе рэагавання ў розныя перыяды? Што ўяўляюць сабой так званыя праграмныя станы і ці можна ў поўнай меры раскрыць «пружыны» адхілення ад норм паводзін? Ці ёсць сувязь паміж анамаліямі. Разабрацца ў складаных пытаннях, звязаных з дзейнасцю мозга, дапаможа гэта кніга.

Запрашаем наведаць справачна-інфармацыйны аддзел бібліятэкі (ауд. 116 «А») і пазнаёміцца з гэтымі і іншымі кнігамі, якія прадстаўлены на выставе новых паступленняў.

**Ф. ЛЯЛЬЧУК,**
**заг. даведачна-інфармацыйнага аддзела.**



«Нёманскія прасторы»
Фотаэцюд
У. САРОКІНА

## Скарбы народнай мовы

Так называецца кніга, якую падрыхтаваў да друку заслужаны настаўнік Беларусі Апанас Пятровіч Цыхун. Гэта плён шматгадовай збіральніцкай і даследчыцкай працы вядомага краязнаўцы Прынёманскага краю, скіраванай на выяўленне і захаванне для нашчадкаў бясцэнных моўных скарбаў родных яму гарадзенскіх гаворак. Усяго ў кнізе каля 10 тысяч лексемаў, устойлівых народных выслоўяў і анамастычных назваў.

Аўтарам сабраны арыгінальныя словы з родных яму гаворак. Гэтыя лексемы не фіксуюцца сучаснымі беларускімі слоўнікамі, у тым ліку і пяцітомным «Тлумачальным слоўнікам беларускай мовы».

Апрача «Лексікі» кніга мае яшчэ 2 часткі: «Анамастыка» і «Устойлівыя выслоўі». У першай падаюцца тапонімы, мікратапонімы Гродзенскага раёна і гідронімы басейна ракі Свіслач, у другой — прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы.

Кніга адрасуецца шырокаму колу чытачоў, аматарам і захавальнікам народнага слова. Разам з тым яна прызначаецца і як навучальны дапаможнік для студэнтаў-філолагаў, найперш з факультэту беларускай філалогіі і культуры. Матэрыялы кнігі паспяхова будуць скарыстаныя падчас падрыхтоўкі лекцыйных курсаў па дыялекталогіі, сучаснай беларускай мове, гісторыі мовы, на лінгвістычных спецкурсах і спецсемінарах. Абавязковым дапаможнікам стане кніга на практычных і лабараторных занятках па дыялекталогіі і падчас выканання кантрольных працаў па гэтай дысцыпліне на завочным аддзяленні. Каштоўны матэрыял для напісання курсавых і дыпломных працаў знойдуць у кнізе студэнты старэйшых курсаў, а таксама даследчыкі лексікалогіі і словаўтварэння, фразеалогіі і анамастыкі роднага краю.

Тапанімія будзе добрым «асялкам» для выпрабавання марфемнай, словаўтваральнай і этымалагічнай здатнасці пачаткоўцаў у навуцы. Фразеалагізмы можна выкарыстаць дзеля спробы складання адпаведнага слоўніка ці для выяўлення спецыфікі і рэгіянальных фраземаў ў іх семантыцы і структуры параўнальна з літаратурнымі.

У ілюстрацыйных прыкладах знайшлі свой адбітак усе найважнейшыя фанетычныя, марфалагічныя і сінтаксічныя рысы гарадзенскай народнай мовы. Таму гэтая праца будзе паспяхова скарыстаная на Гарадзеншчыне пры вывучэнні — у супастаўляльным плане — беларускай літаратурнай і народна-дыялектнай мовы ў школах, ліцэях, гімназіях і ВНУ. Бо менавіта параўнальнае вывучэнне нормаў літаратурнай мовы і мясцовых адметнасцяў дае найлепшыя вынікі ў аваладанні агульнанароднай мовай. Спрыяць будуць гэтаму і пазакласныя заняткі, скіраваныя на выяўленне адметных лексемаў у мясцовых гаворках, складанне вучнямі дыялектных слоўнікаў.

Словам, прапанаваная чытачу кніга стане яго дарадцам у выкарыстанні і ахове роднага слова, гісторыі роднай старонкі.

**П. СЦЯЦКО,**
**навуковы рэдактар кнігі.**

## З усмешкай

### ВЫКАНАНЫ АБЕТ

Габравец захварэў. Шмат дзён не падымаўся з ложка. Аднойчы ён сабраў усе свае сілы і падняўся, стаў на калені перад кіотам, памаліўся і даў такі абет:

— Божа, калі я папраўлюся па тваёй міласці, то прадам каня і на ўсе грошы пастаўлю табе свечак.

Хутка габравец выздаравеў. Трэба было выканаць абет. Думаў ён, думаў і прыдумаў: пасадзіў у мяшок курыцу, узяў каня і пайшоў на базар.

— Прадаю каня за два лева! — закрычаў габравец.— Каня за два лева!

Сабраўся народ. На такую дзешавізну пакваліліся многія.

— Толькі я прадаю каня разам з курыцай, а яна каштуе дзвесце леваў,— дабавіў габравец.

Прадаўшы каня і курыцу, ён пайшоў у царкву і паставіў свечак на два лева — колькі каштаваў конь.

### ПРОСТЫ ЧАЛАВЕК

Прадавец павесіў над дзвярыма ў краму шыльду, напісаную вельмі непрыгожа і з памылкамі. Яму зрабілі заўвагу, але ён адказаў:

— Няхай пакупнікі думаюць, што прадавец — прастачок, якога лёгка падмануць.

### ТАДЫ— ТОЛЬКІ ГАРЧЫЦУ

Габравец папрасіў прадаўца даць яму сто грамаў каўбасы. Прадавец падаў яму каўбасу разам са шкляначкай гарчыцы.

— Але я не прасіў гарчыцы! — дзівіўся габравец.

— Яна бясплатная, [illegible]а каўбасы!

— Тады дайце мне толькі гарчыцу!

### У ЛАЗНІ

— Колькі каштуе білет у ванну?

— Два лева.

— Вось вам адзін леў, наліце ванну да паловы.

### САПРАЎДНАЯ ГАБРАЎКА

Габравец купіў аўтамабіль. Аднак, разлічваючыся, ён затрымаў частку яго кошту ў выглядзе гарантыі, тэрмінам на месяц. Не прайшло і трох дзён, як прадавец атрымаў назад аўтамабільны сігнал з наступнай запіскай ад жонкі пакупніка:

«Вяртаю Вам сігнал, таму што мой муж, патрэніраваўшыся, навучыўся сам гудзець. Адлічыце кошт гудка з астатку сумы, якая Вам належыць».

### У ГАСЦЯХ

Габравец з сынам прыехаў у госці да сястры.

— Падстаў ручку, я насыплю табе арэхаў,— сказала цёця маленькаму хлопчыку.

— Насыпце іх лепш тату.

— Хіба ты не любіш арэхаў?

— Люблю. Але ў таты рука большая.

### У ГАБРАЎСКАЙ ШКОЛЕ

Настаўнік расказвае вучням аб уласцівасцях металаў.

— Дзеці, зараз я апушчу гэты залаты грош у кіслату. Скажыце, як па-вашаму, ён растворыцца ў ёй?

— Не! — сказаў адзін з вучняў.

— Чаму?

— Калі б ён мог растварыцца, вы б ні за што не апускалі яго ў кіслату...

Наш адрас:
230023, г. Гродна,
вул. Ажэшкі, 22, пакой 404,
тэл. 44-72-97

Газета выходзіць два разы ў месяц
Аб'ём газеты — адзін друкаваны аркуш

Газета надрукавана афсетным спосабам у Гродзенскай абласной узбуйненай друкарні
г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4
Падпісана ў друк у 15 00.

Наклад 2 000 экз.

Зак. 4543

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
САВЕТ УНІВЕРСІТЭТА,
ПРАФКАМ СУПРАЦОЎНІКАЎ,
ПРАФКАМ СТУДЭНТАЎ

*В. а. рэдактара*
*У. П. АМЕЛЬКА*